ISSN 2078-5534. Вісник Львівського університету. Серія філологічна. 2019. Випуск 71. Ч. I. С. 349–357
Visnyk of Lviv University. Series Philology. Issue 71. Vol. I. P. 349–357

*УДК 811.161.3'373.21*

**doi: http://dx.doi.org/10.30970/vpl.2019.71.10306**

# ТРЫ ВЕРСІІ ПАХОДЖАННЯ НАЗВЫ ЎСХОДНЕПАЛЕСКАГА БАЛОТНАГА МАСІВУ *ГРЫЧЫН*

**Вадзім Шклярык**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,*
*філіял "Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа",*
*вул. Сурганава, 1/2, Мінск, Беларусь, 220072,*
*тэл.: (+375 17) 284 18 85*
*e-mail: vsh@philology.by*

У артыкуле разглядаюцца тры версіі паходжання назвы ўсходнепалескага балотнага масіву *Грычын*, прапанаваныя беларускімі даследчыкамі. З улікам разнастайных моўных і пазамоўных фактаў устанаўліваецца ступень праўдападобнасці кожнай з гэтых версій.

Матэрыял падрыхтаваны ў рамках рэалізацыі праекта № Г19-078 ад 02.05.2019 г. пры падтрымцы БРФФД.

*Ключавыя словы:* мікратапонім, апелятыў, антрапонім, Беларусь, Усходняе Палессе.

Усходняе Палессе, якое лакалізуецца ў паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі, з'яўляецца буйным гісторыка-этнаграфічным рэгіёнам краіны. Менавіта на яго тэрыторыі – на сумежжы Брэсцкай, Гомельскай і Мінскай абласцей – знаходзіцца балотны масіў *Гры́чын*. На старонках навуковых і навукова-папулярных выданняў гэты аб'ект згадваецца ўжо ў XIX стагоддзі, хоць узнік ён, мяркуючы па ўсім, значна раней. Беларускія даследчыкі, якія ў другой палове XX стагоддзя распачалі актыўнае вывучэнне айчынных тапонімаў, не маглі абмінуць увагай і найменне *Грычын*. У выніку былі прапанаваны розныя версіі яго паходжання. Сама ж назва цяпер з'яўляецца хутчэй мікратапонімам, на што паўплывала масавае асушэнне палескіх балот.

**Пастаноўка праблемы, мэта даследавання.** З прычыны нярэдкай мнагазначнасці апелятываў і іх аманімічнасці этымалагізацыя суадносных з такімі словамі мікратапонімаў выклікае пэўныя цяжкасці. Выяўленне верагоднай матывацыі ўскладняецца тым, што асобныя назвы дробных геаграфічных аб'ектаў існуюць даволі працяглы час, таму сённяшнія інфарманты часта не ў стане дапамагчы вучоным ва ўстанаўленні паходжання падобных найменняў. У шэрагу выпадкаў гэтыя нюансы прыводзяць да немагчымасці адназначнай этымалагізацыі назваў дробных геаграфічных аб'ектаў, што вымагае дапушчэння некалькіх варыянтаў працэсу іх утварэння.

Працяглы час вывучаючы мікратапанімікон беларускага Усходняга Палесся, мы выявілі ў спецыяльнай літаратуры тры версіі паходжання назвы балотнага масіву *Грычын*, якія ў розны час былі прапанаваны трыма беларускімі даследчыкамі – І. Я. Яшкіным, В. А. Жучкевічам і М. П. Антропавым. Такім чынам, мэта нашага даследавання – прааналізаваць выяўленыя версіі ўзнікнення мікратапоніма *Грычын* і вызначыць найбольш праўдападобную (ці праўдападобныя) з іх.

© Шклярык В., 2019

**Актуальнасць даследавання.** Вынікі працы па ўстанаўленні паходжання той або іншай назвы дробнага геаграфічнага аб’екта з’яўляюцца актуальнымі і запатрабаванымі па шэрагу прычын. Маючы комплексны характар, такое даследаванне патрабуе звароту да звестак з гісторыі мовы і дыялекталогіі, што часам дазваляе атрымаць новыя факты, якія ў перспектыве могуць быць выкарыстаны ў розных галінах мовазнаўчай (і не толькі) навукі. Акрамя таго, немалую ролю ў падобных росшуках іграюць і экстралінгвістычныя фактары, улік якіх дапамагае не толькі паглядзець на моўную з’яву пад іншым вуглом, але і павысіць верагоднасць зробленых вывадаў.

**Аналіз апошніх даследаванняў і публікацый.** За апошнія дзесяцігоддзі з друку выйшла адносна няшмат прац, прысвечаных вывучэнню беларускага ўсходнепалескага мікратапанімікону. Гэта артыкулы В. А. Служэнка “З назіранняў над мікратапонімамі в. Казялужжа Хойніцкага раёна” [21], Б. А. Крука “Мікратапонімы ваколіц вёскі Млынок Петрыкаўскага раёна як адлюстраванне яе гісторыі” [13], Л. В. Жураўскай, А. В. Вяргун “Структурна-семантычныя асаблівасці айконімаў і мікратапонімаў вёскі Хатынічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці” [8] і інш., а таксама манаграфіі Г. А. Івановай “Микротопонимия Мозырского Полесья” [11] і А. Ф. Рогалева “Топонимия Беларуси: Гомельская область. Лоевский район” [19]. Як зразумела з назваў гэтых работ, у іх разглядаюцца найменні, якія бытуюць вакол асобных населеных пунктаў або ў адным або некалькіх раёнах беларускага Усходняга Палесся, таму назва *Грычын* ні ў адной з пералічаных прац не сустракаецца.

У некаторай ступені абагульняльнай работай, прысвечанай назвам дробных геаграфічных аб’ектаў усёй акрэсленай тэрыторыі, з’яўляецца манаграфія “Мікратапанімія Усходняга Палесся ў кантэксце развіцця рэгіянальнай лексічнай сістэмы” [22], аднак згаданы гелонім не знайшоў адлюстравання і ў ёй. Без аналізу найменне *Грычын* прыводзіцца толькі ў апублікаванай у 2011 годзе падборцы мікратапонімаў У. Барысюка [3] і шэрагу ранейшых прац іншых аўтараў. Інфармацыя ж пра паходжанне гэтай і падобных назваў змешчана ў слоўніках І. Я. Яшкіна [23; 24] і кнізе навукова-папулярных эцюдаў В. П. Лемцюговай “Тапонімы распавядаюць” [14], а таксама ў работах 1970-х гадоў – працы В. А. Жучкевіча “Краткий топонимический словарь Белоруссии” [9] і артыкуле М. П. Антропава “Об одном фрагменте белорусского микротопонимического словаря” [2].

**Выклад асноўнага матэрыялу.** Дастаткова падрабязнае апісанне балотнага масіву *Грычын* пададзена ў адпаведным томе навукова-папулярнага выдання “Живописная Россия”, якое выходзіла ў Санкт-Пецярбургу ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя: “У паўночнай частцы Мазырскага павета, каля мяжы са Слуцкам, часткова і ў Пінскім знаходзіцца знакамітае балота Грычын, якое называюць залівам былога мора [...]. Балота Грычын вылучаецца сярод іншых тым, што яно непарыўнае, адкрытае і непраходнае. Паверхня яго займае не менш за 500 вёрст. Часам толькі ў вельмі спякотнае лета яно даступнае для зносін, але і то толькі для вопытных старажылаў і не інакш, як па вадзе” [7: 342]. Адным з самых вялікіх балот Палесся называе *Грычын* (у крыніцы фігуруе форма *Гричино*) расійскі геадэзіст І. І. Жылінскі [17: 276]. Акцэнтуе ўвагу на “вядомым гальным балоце Грычыне” і беларускі этнограф І. А. Сербаў [20: XII].

У другой палове XX – пачатку XXI стагоддзя, згодна з падборкамі мікратапонімаў і артыкуламі, назва *Грычын* фіксуецца ў Брэсцкай і Гомельскай

ISSN 2078-5534 Вісник Львівського університету. Серія філологічна. 2019. Випуск 71

абласцях (гл. карту): *Грíчін* балота (Намакрава, Сітніцкі Двор Лунінецкага раёна) [16: 64], *Гры́чын* балота (Чудзін Ганцавіцкага раёна) [16: 65], *Грычы́н* былое балота (Дзятлавічы Лунінецкага раёна) [3: 34], *Гры́чын* балота (Грычынавічы Жыткавіцкага раёна) [15: 153]. Сюды ж, відаць, можна аднесці і прэфіксальнае ўтварэнне *На́грычынь* паша, сенакос (Вялікае Малешава Столінскага раёна) [4: 192]. Як вынікае з лакалізацыі, прыведзеныя найменні выкарыстоўваюцца для абазначэння таго самага балотнага масіву, якія быў апісаны ў працах канца XIX – пачатку XX стагоддзя.

Што датычыць паходжання назвы *Грычын*, то меркаванні даследчыкаў на гэты конт разыходзяцца: І. Я. Яшкін і М. П. Антропаў лічаць, што ўзнікненне дадзенага мікратапоніма з’яўляецца вынікам анімізацыі, у той час як В. А. Жучкевіч і В. П. Лемцюгова (разглядаючы падобны айконім) схіляюцца да трансанімізацыі. Разам з тым у якасці ўтваральнай базы наймення кожны з адзначаных вучоных бачыць лексічныя адзінкі рознага паходжання, што дазваляе гаварыць пра пэўную ўнікальнасць мікратапоніма *Грычын* з пункту гледжання яго этымалагізацыі.

Сутнасна версія І. Я. Яшкіна грунтуецца на існаванні геаграфічнага тэрміна *гры́чы́н* [23: 54; 24: 220], анімізацыя якога і прывяла, як мяркуецца, да ўзнікнення гелоніма. Але, па-першае, такі апелятыў у слоўніках і атласах, якія адлюстроўваюць лексічны склад беларускіх гаворак, намі не выяўлены. Па-другое, сам тэрмін лакалізаваны І. Я. Яшкіным у Лунінецкім і Салігорскім раёнах, дзе якраз і знаходзіцца балотны масіў *Грычын*. Гэта дае падставы сцвярджаць, што даследчык, хутчэй за ўсё, памылкова этымалагізаваў адпаведныя тапонімы, вывеўшы іх паходжанне ад “рэканструяванага”, але не зафіксаванага ў іншых крыніцах тэрміна *грычын*.

На думку М. П. Антропава, назву балота *Грычын* правамерна звязваць з палескім найменнем вераценніка (лац. Limosa limosa) – *гры́чык* ці з назвай птушкі з роду саракапутаў (лац. Lanius) – *грычу́н* [2: 91]. Аднак такі варыянт паходжання мікратапоніма таксама падаецца малаверагодным. Па-першае, прыведзеныя арнітонімы не супадаюць з гелонімам па форме. Па-другое, назвы дробных геаграфічных аб’ектаў даволі рэдка ўтвараюцца ад фаўністычных найменняў [1: 20–21; 6: 129; 10: 54–55], што яшчэ больш зніжае верагоднасць выкарыстання назвы птушкі для іменавання балота. Усё гэта не дазваляе лічыць прапанаваную М. П. Антропавым версію імавернай.

На верагоднасць патранімічнага паходжання назвы балотнага масіву *Грычын* (у крыніцы фігуруе форма *Гры́чна*) указваў у свой час В. А. Жучкевіч [9: 86]. Першым звяном у гэтым этымалагічным ланцужку вучоны прапаноўваў лічыць апелятыў *грыч* ‘сабака’, адзначаны ў тым ліку ў “Гістарычным слоўніку беларускай мовы” [5, вып. 7: 162–163]. У сваю чаргу В. П. Лемцюгова, разглядаючы айконім *Гры́чына* (у даўніх пісьмовых крыніцах паселішча ўпамінаецца пад назвай *Гричин*), бачыць у яго аснове ўласнае асабовае імя *Грыч* – варыянт царкоўнага праваслаўнага імя *Григорий* [14: 137]. Улічваючы тое, што пры дапамозе фарманта *-ын (-ына)* сапраўды можа выражацца прыналежнасць (у дадзеным выпадку – прыналежнасць балотнага масіву пэўнай асобе ці асобам), утварэнне мікратапоніма *Грычын* праз далучэнне да антрапоніма *Грыч* адпаведнага суфікса ўяўляецца цалкам магчымым. Тое ж можна сказаць і пра трансанімізацыю антрапоніма *Грычын*, якая бачыцца яшчэ адным прымальным варыянтам матывацыі гелоніма.

Сёння цяжка вызначыць, які антрапонім лёг у аснову наймення *Грычын* – утвораны ад апелятыва *грыч* ці ад імя *Григорий*. Але той факт, што людзі з прозвішчам (або мянушкай) *Грычын* сапраўды мелі дачыненне да Палесся, ускосна

пацвярджаецца існаваннем у Жыткавіцкім раёне, на ўсходняй ускраіне балотнага масіву *Грычын*, вёскі з патранімічнай па сваёй форме назвай *Грычы́навічы*. Акрамя таго, у розных крыніцах, датычных палескай тэрыторыі, згадваюцца і колішнія носьбіты гэтага прозвішча (або мянушкі): "У 1495 годзе пінская князёўна Марыя даруе два дворышчы Мацвею Грычыне…" [12], "…землеўладальнік гаспадарскі Пінскі Рыгор Іванавіч Грычын…" [18: 667].

**Высновы.** Такім чынам, сярод прапанаваных беларускімі даследчыкамі І. Я. Яшкіным, В. А. Жучкевічам і М. П. Антропавым версій паходжання назвы ўсходнепалескага балотнага масіву *Грычын* найбольш праўдападобнай можна лічыць тую, у якой фігуруе трансанімізацыя. Сувязь разгледжанага гелоніма з гіпатэтычным апелятывам *грыч/грычын* звесткамі са слоўнікаў і атласаў, якія адлюстроўваюць лексічны склад беларускіх гаворак, не пацвярджаецца. Угрунтаваць або абвергнуць зробленыя высновы дазволіць зварот да дыялектных (у тым ліку анамастычных) крыніц з іншых славянскіх тэрыторый.

**Перспектывы выкарыстання вынікаў даследавання.** Вынікі праведзенага даследавання будуць запатрабаваны пераважна сярод анамастаў і краязнаўцаў. Спецыялісты ў галіне вывучэння ўласных найменняў, азнаёміўшыся са сціслым разглядам наяўных версій паходжання мікратапоніма *Грычын*, змогуць выкарыстоўваць гэты матэрыял падчас устанаўлення праўдападобнай матывацыі ў выпадку з іншымі назвамі дробных геаграфічных аб'ектаў. Спецыялісты па краязнаўстве атрымаюць, магчыма, новыя кірункі для вывучэння гісторыі рэгіёна, ідэі для пошуку ў архіўных крыніцах звестак пра асоб, якія маглі мець дачыненне да тых або іншых аб'ектаў краю.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. *Адамовіч Я. М.* Мікратапанімічныя назвы / Я. М. Адамовіч. – Мінск : Выш. шк., 1971. – 112 с.

2. *Антропов Н. П.* Об одном фрагменте белорусского микротопонимического словаря / Н. П. Антропов // Тыпалогія славянскіх моў і ўзаемадзеянне славянскіх літаратур. Тэзісы дакладаў III Рэспубліканскай канферэнцыі. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1977. – Ч. 1. – С. 90–91.

3. *Барысюк У.* У слоўнік мікратапонімаў гаворак Брэсцка-Пінскага Палесся / У. Барысюк // Моўнакультурная прастора Брэсцка-Пінскага Палесся : зб. навук. арт. : у 2 ч. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т, каф. гісторыі беларус. мовы і дыялекталогіі ; рэдкал.: М. М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст : Альтернатива, 2011. – Ч. 1. – С. 31–36.

4. *Вярэніч В. Л.* Палескі архіў / В. Л. Вярэніч. – Мінск : ІП Вараксін, 2009. – 692 с.

5. Гістарычны слоўнік беларускай мовы : у 37 вып. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства ; рэдкал.: А. І. Жураўскі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка : Беларус. навука, 1982–2017.

6. *Емельянович В. М.* Микротопонимия северо-западной части Брестской области : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.02 / В. М. Емельянович. – Минск, 1982. – 308 л. – Библиогр. : л. 180–193.

7. Живописная Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литов. и Белорус. Полесье : Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – 2-е изд. – Минск : БелЭн, 1994. – 550 с.

8. *Жураўская Л. В.* Структурна-семантычныя асаблівасці айконімаў і мікратапонімаў вёскі Хатынічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці / Л. В. Жураўская, А. В. Вяргун // Слово. Текст. Социум : сб. науч. тр. / Мозыр. гос. пед. ун-т ; редкол.: Л. В. Исмайлова (отв. ред.) [и др.]. – Мозырь : МГПУ, 2014. – С. 96–101.

9. *Жучкевич В. А.* Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск : Изд-во БГУ, 1974. – 448 с.

10. *Иванова А. А.* Микротопонимия Мозырского Полесья : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.02 / А. А. Иванова. – Минск, 1986. – 201 л. – Библиогр. : л. 178–201.

11. *Иванова А. А.* Микротопонимия Мозырского Полесья : монография / А. А. Иванова. – 2-е изд. – Мозырь : МГПУ, 2007. – 220 с.

12. *Кисель Д.* Поречье. История одного села на берегу Ясельды / Д. Кисель // Медиа-Полесье [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://media-polesye.by/news/poreche-istoriya-odnogo-sela-na-beregu-yaseldy-22550.

13. *Крук Б. А.* Мікратапонімы ваколіц вёскі Млынок Петрыкаўскага раёна як адлюстраванне яе гісторыі / Б. А. Крук // Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў : матэрыялы II Міжнар. навук. канф., Мазыр, 22–23 крас. 2010 г. / Мазыр. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В. В. Шур (адк. рэд.) [і інш.]. – Мазыр : МДПУ, 2010. – С. 199–201.

14. *Лемцюгова В. П.* Тапонімы распавядаюць : навук.-папул. эцюды / В. П. Лемцюгова. – Мінск : Литература и Искусство, 2008. – 416 с.

15. Матэрыялы для слоўніка гідронімаў Гомельшчыны: Жыткавіцкі раён // Беларуская мова. – 1988. – Вып. 16. – С. 146–153.

16. Мікратапанімія Беларусі. Матэрыялы / АН БССР, Ін-т мовазнаўства ; рэд.: М. В. Бірыла, Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 328 с.

17. Очеркъ работъ западной экспедиціи по осушенію болотъ (1873–1898) / М-во земледѣлія и гос. имуществъ ; сост. I. И. Жилинскій. – Санкт-Петербург : Тип. Спб. акц. общ. печатнаго дѣла въ Россіи Е. Евдокимовъ, 1899. – [4], V, 742, [2] с.

18. *Паляшчук Н. В.* Пінскія акты: аспекты лінгвістычнага апісання / Н. В. Паляшчук // Проблемы рационального использования природных ресурсов и устойчивое развитие Полесья : сб. докл. Междунар. науч. конф. (Минск, 14–17 сент. 2016 г.). В 2 т. Т. 2 / Нац. акад. наук Беларуси [и др.] ; редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2016. – С. 667–671.

19. *Рогалев А. Ф.* Топонимия Беларуси: Гомельская область. Лоевский район / А. Ф. Рогалев. – Гомель : ГГУ, 2015. – 317 с.

20. *Сербовъ И. А.* Бѣлоруссы-сакуны. Краткій этнографическій очеркъ / И. А. Сербовъ // Сб. Отд-нія рус. языка и словесности Имп. акад. наукъ. – 1915. – Т. XCIV. – № 1. – XVII, 180 с.

21. *Служэнка В. А.* З назіранняў над мікратапонімамі в. Казялужжа Хойніцкага раёна / В. А. Служэнка // Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Мазыр. дзярж. пед. ун-т ; адк. рэд.: А. В. Солахаў, В. В. Шур. – Мазыр : МДПУ, 2006. – С. 189–190.

22. *Шклярык В. А.* Мікратапанімія Усходняга Палесся ў кантэксце развіцця рэгіянальнай лексічнай сістэмы / В. А. Шклярык ; навук. рэд. І. Л. Капылоў. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 196 с.

23. *Яшкін І. Я.* Беларускія геаграфічныя назвы / І. Я. Яшкін ; рэд. М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 256 с.

24. *Яшкін І. Я.* Слоўнік беларускіх мясцовых геаграфічных тэрмінаў: Тапаграфія. Гідралогія / І. Я. Яшкін. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 808 с.

## REFERENCES

1. Adamovich, Ja. M. (1971). *Mikratapanimichnyja nazvy*. Minsk: Vysh. shk.
2. Antropov, N. P. (1977). Ob odnom fragmientie bielorusskogo mikrotoponimichieskogo slovaria. In: *Typalohija slavianskikh mou i uzajemadziejannie slavianskikh litaratur. Tezisy dakladau III Respublikanskaj kanfierentsyji*. Minsk: Vyd-va BDU, *ch. 1*, 90–91.
3. Barysiuk, U. (2011). U slounik mikrataponimau havorak Brestska-Pinskaha Paliessia. In: *Mounakulturnaja prastora Brestska-Pinskaha Paliessia: zb. navuk. art.: u 2 ch.* / M-va adukatsyji Resp. Bielarus, Brests. dziarzh. un-t, kaf. historyji bielarus. movy i dyjaliektalohiji ; redkal.: M. M. Aliakhnovich [i insh.]. Brest: Alternativa, *ch. 1*, 31–36.
4. Viarenich, V. L. (2009). *Palieski arkhiu*. Minsk: IP Varaksin.
5. *Histarychny slounik bielaruskaj movy: u 37 vyp*. (1982–2017). / AN BSSR, In-t movaznaustva ; redkal.: A. I. Zhurauski (hal. red.) [I insh.]. Minsk: Navuka i tekhnika: Bielarus. navuka.
6. Jemiel'janovich, V. M. (1982). *Mikrotoponimija sieviero-zapadnoj chasti Briestskoj oblasti: dis. ... kand. filol. nauk: 10.02.02*. Minsk, 308 l. Bibliogr.: l. 180–193.
7. *Zhivopisnaja Rossija: Otiechiestvo nashie v jego ziem., ist., pliem., ekon. i byt. znachieniji: Litov. i Bielorus. Polies'je : Rieprint. vosproizviedienije izd. 1882 g*. 2-e izd. (1994). Minsk: BelEn.
8. Zhurauskaja, L. V., Viarhun, A. V. (2014). Strukturna-siemantychnyja asablivastsi ajkonimau i mikrataponimau vioski Khatynichy Hantsavitskaha rajona Brestskaj voblastsi. In: *Slovo. Tiekst. Socyum : sb. nauch. tr.* / Mozyr. gos. pied. un-t; riedkol.: L. V. Ismajlova (otv. red.) [i dr.]. Mozyr': MGPU, 96–101.
9. Zhuchkievich, V. A. (1974). *Kratkij toponimichieskij slovar' Bielorussii*. Minsk: Izd-vo BGU.
10. Ivanova, A. A. (1986). *Mikrotoponimija Mozyrskogo Polies'ja: dis. ... kand. filol. nauk: 10.02.02*. Minsk, Bibliogr.: l. 178–201.
11. Ivanova, A. A. (2007). *Mikrotoponimija Mozyrskogo Polies'ja: monografija*. 2-e izd. Mozyr': MGPU.
12. Kisiel', D. Poriech'je. Istorija odnogo siela na bieriegu Jasiel'dy. In: *Media-Polies'je*. Retrieved from https://media-polesye.by/news/poreche-istoriya-odnogo-sela-na-beregu-yaseldy-22550.
13. Kruk, B. A. (2010). Mikrataponimy vakolits vioski Mlynok Pietrykauskaha rajona jak adliustravannie jaje historyji. In: *Nadzionnyja prabliemy lieksikalohiji i anamastyki slavianskikh mou: materyjaly II Mizhnar. navuk. kanf., Mazyr, 22–23 kras. 2010 h.* / Mazyr. dziarzh. pied. un-t ; redkal.: V. V. Shur (adk. red.) [i insh.]. Mazyr: MDPU, 199–201.
14. Liemtsiuhova, V. P. (2008). *Taponimy raspaviadajuts': navuk.-papul. etsiudy*. Minsk: Litieratura i Iskusstvo.
15. Materyjaly dlia slounika hidronimau Homiel'shchyny: Zhytkavitski rajon. (1988). In: *Bielaruskaja mova, vyp. 16*, 146–153.
16. *Mikratapanimija Bielarusi. Materyjaly*. (1974). / AN BSSR, In-t movaznaustva; red.: M. V. Biryla, Ju. F. Matskievich. Minsk: Navuka i tekhnika.

ISSN 2078-5534 Вісник Львівського університету. Серія філологічна. 2019. Випуск 71

17. *Ochierk rabot zapadnoj ekspiedicii po osusheniju bolot (1873–1898).* (1899). / M-vo ziemliedelija i gos. imushhiestv; sost. I. I. Zhilinskij. Sankt-Peterburg: Tip. Spb. akc. obshh. piechatnago diela v Rossii Je. Jevdokimov, [4], V, 742, [2].
18. Paliashchuk, N. V. (2016). Pinskija akty: aspiekty linhvistychnaha apisannia / N. V. Paliashchuk. In: *Probliemy racional'nogo ispol'zovanija prirodnykh resursov i ustojchivoje razvitije Poles'ja : sb. dokl. Miezhdunar. nauch. konf. (Minsk, 14–17 sent. 2016 g.). V 2 t. T. 2* / Nac. akad. nauk Bielarusi [i dr.] ; riedkol.: V. G. Gusakov (gl. red.) [i dr.]. Minsk: Bielarus. navuka, 667–671.
19. Rogaliev, A. F. (2015). *Toponimija Bielarusi: Gomiel'skaja oblast'. Lojevskij rajon*. Gomiel': GGU.
20. Sierbov, I. A. (1915). Bielorussy-sakuny. Kratkij etnografichieskij ochierk. In: *Sb. Otd-nija rus. jazyka i sloviesnosti Imp. akad. nauk, t. XCIV, № 1.* XVII, 180 s.
21. Sluzhenka, V. A. (2006). Z naziranniau nad mikrataponimami v. Kazialuzhzha Khojnitskaha rajona. *Nadzionnyja prabliemy lieksikalohii i anamastyki slavianskikh mou: zb. navuk. art.* / M-va adukatsyji Resp. Bielarus', Mazyr. dziarzh. pied. un-t; adk. red.: A. V. Solakhau, V. V. Shur. Mazyr: MDPU, 189–190.
22. Shkliaryk, V. A. (2017). *Mikratapanimija Uskhodniaha Paliessia u kantekstsie razvitstsia rehijanalnaj lieksichnaj sistemy* / navuk. red. I. L. Kapylou. Minsk: Bielarus. navuka.
23. Jashkin, I. Ja. (1971). *Bielaruskija hieahrafichnyja nazvy* / I. Ja. Jashkin; red. M. V. Biryla. Minsk: Navuka i tekhnika.
24. Jashkin, I. Ja. (2005). *Slounik bielaruskikh miastsovykh hieahrafichnykh terminau: Tapahrafija. Hidralohija*. Minsk: Bielarus. navuka.

*Стаття надійшла до редколегії 15. 05. 2019*
*прийнята до друку 10. 06. 2019*

## THREE VERSIONS OF THE ORIGIN OF EASTERN PALIESSIE VAST WETLAND *HRYCHYN*

**Vadzim Shkliaryk**

*The Center for the Belarusian Culture, Language and Literature Research*
*of the National Academy of Sciences of Belarus,*
*the branch "Yakub Kolas Institute of Linguistics",*
*1/2, Surhanava Str., Minsk, Belarus, 220072,*
*phone (+375 17) 284 18 85*
*e-mail: vsh@philology.by*

Eastern Paliessie is a major historical and ethnographic region located in the south-eastern part of Belarus. The territory of this region includes a vast wetland *Hrychyn*. In the scientific and popular publications, this object is mentioned already in the 19th century, but it appeared apparently much earlier. Due to the massive draining of Paliessie swamps, this name is rather a microtoponym today.

Belarusian scientists, who began to actively explore place names in the second half of the 20th century, could not ignore the name *Hrychyn*. As a result, I. Ja. Jashkin, V. A. Zhuchkievich, and N. P. Antropov offered different versions of the origin of this microtoponym, which are related to the onymization and transonymization. The purpose of our study is to analyze the revealed versions of the origin of *Hrychyn* and to determine the most plausible one.

Due to the frequent polysemy of appellatives and their homonymity, it is difficult to establish the origin of the microtoponyms related to such words. The establishing of probable motivation is complicated by the fact that some place names exist for a long time. For this reason, informants today are often not able to help scientists find out the origin of such names. In some cases, this prevents the establishing of the only one correct motivation of each microtoponym and requires the admission of several variants of the process of their formation.

Nevertheless, the results of work to determine the origins of place names are actual and highly demanded. Such a study is a complex one that requires the data from the history of language, dialectology, etc. Resorting to them sometimes allows scientists to obtain new facts, which can be used in different branches of linguistics in the future. In addition, extralinguistic factors also play a significant role in such researches. Taking them into account helps to look at a language phenomenon from a different angle and to increase the probability of arriving at appropriate conclusions.

*Keywords:* microtoponym, appellative, anthroponym, Belarus, Eastern Paliessie.

ISSN 2078-5534 Вісник Львівського університету. Серія філологічна. 2019. Випуск 71

**Мікратапонімы Грічін, Грычын, Нагрычынь на тэрыторыі беларускага Усходняга Палесся**

